Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул., № 29.

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 22 Мая 1914 г. № 20

Просімо п. п. Падпісчыкоў „Нашай Нівы", каторые падпісаліся толькі на першую палавіну 1914 г. чым хутчэй аднавіць падпіску, каб не было перарыву у высылцы газэты.

## Дзьве работы.

Як вядома, у нашым краі верхаводзяць найболей дзьве «пануючые» нацыі, маскоўцы і палякі. Прэдстаўнікі гэтых нацый са староны расейскай—чыноўніцтво, са староны польскай — панство. Як першые, так і другіе, з дужа малымі выняткамі належуць да нацыяналістычнаго табору с тэй толькі розніцай, што адны належуць да расейскіх другіе да польскіх нацыяналістоў.

А нацыяналізм бывае дваякі. Нацыяналізм сільных і нацыяналізм слабых. Першы кіруецца да панаваньня над слабейшымі, — да заваёвываньня, коштам слабейшых, сабе пануючаго палажэньня, да агранічэньня усіх, хто не належыць да іхняй нацыі і інш., адным словам, пануючы нацыяналізм кіруецца да паняволеньня, да агранічэньня у правах слабейшых. Нацыяналізм слабых, наадварот кіруецца да вызваленьня паняволеных, да абароны чэлавечых правоў і прызнаньня чэлавека у кожным.

Нацыяналісты, з расейскаго і польскаго боку, што жывуць у нашым краю, ваюючы, на сьмерць паміж сабой, яны усёж такі зыходзюцца і ідуць, хоць часта рознымі дарогамі, да аднэй мэты, да агранічэньня і паняволеньня, трэцяй, слабейшай нацыі у нашым краю, нас Беларусоў.

Палякі у нашым краю, як вядома найболей памешчыкі і дзеля гэтаго апорай свайго быту у гэтым краю, лічуць зямлю. Адзін з найважнейшых пунктоў праграмы мейсцовых польскіх нацыяналістоў, гэта утрыманьне у сваіх руках зямлі А калі памешчыкі самі, з экономічных прычын, ня здолеюць утрымаць зямлю, то яны павінны прадаваць зямлю толькі селянам с польшчы. На гэта палякі тутэйшые глядзяць як на самаабарону, як на утрыманьне імі у нашым краю занятых пазыцый (stanu pasiadania). І дзеля выпаўненьня гэтай праграмы працуе не мала людзей.

Тых памешчыкоў, каторые прадаюць зямлю не палякам, заносюць у чорные спіскі і публікуюць, як здраднікоў у газэтах.

Побоч з гэтым працуе у нашым краю і селянскі (крестьянскій) банк, каторы, у свой чарод, распрадае землі вялікарусам селянам, найболей стараверам. Палітыка банка, гэта палітыка ваюючаго нацыяналізму, палітыка наступаючая, не абараніцельная.

Гэткім парадкам, у стасунку да зямлі, у нас робюцца дзьве «работы» у розные бакі і з розных пабудак а абезьве бьюць найслабейшаго, адвечнаго жыхара зямлі гэтай—Беларуса.

Адным словам з аднаго і з другога боку ідзе работа над тым, каб захапіць зямлю і, праз гэтае самае выціснуць беларусоў з зямлі.

Б.

## Земство і валасць.

II

**Як нарыхтавана цяпер земство у Расеі.**

У 1864 г. у 34 губэрнях Эўропэйскай Расеі--было заведзено земство. Зрабілі гэта дзеля таго. што благіе рэзультаты чыноўніцкай гаспадаркі—паказалі сябе надта ужо выразна. Стала ясна, што каб упарадкаваць гэтые справы трэба канешне прыцягнуць да кіраваньня імі само грамадзянства

Каб земская гаспадарка велася добра, то найсправедлівей было-б каб выбіраць земскіх гласных усе мелі роўные правы ды гласные выбіраліся супольна усім насяленьнем, але урад пайшоў інакшай дарогай. Ён пастанавіў, што паны, жыхары гарадоў і селянскіе валасьці павінны аддзельна, кожны ад сябе, выбіраць гласных, а гласные ужо зьедуцца разам на земскае сабраньне. Паводле гэтаго закону селяне выбіраюць 38% гласных, а паны і чыноўнікі 42% (гэта значыць с кожных 100 гласных—прыходзіцца 38 селянскіх, 42 панскіх). С самаго пачатку земствы былі пастаўлены у залежнасць ад адміністрацыі, каторая далёка не заўсяды спагадючa адносілася да працы земств да іх праектаў. У 1890 г. выйшоў новы закон, каторы зрабіў земствы ешчэ болей залежнымі ад адміністрацыі, ды лік гласных ад селян ешчэ болей зменшылі (цяпер іх стала толькі усяго 28%), а ад паноў збольшылі.

Дзеля таго што адны справы маюць значэньне толькі для аднаго павету, другіе для усяе губэрніі, ці вымагаюць такога вялікаго кошту, што жыхаром аднаго павету цяжка гэта наладзіць, то земствы былі заведзены двух сартоў: паветовые — у кожным павеці — і губэрнскіе. Важнейшые справы абгаварываюцца на земскіх сабраньнях, на якіе зьежджаюцца на некольні дзён,—што год —выбранные гласные (гласных выбіраюць на 3 гады, як гэты час пройдзе — дык новые выбары). Дзеля даглёду за земскай гаспадаркай, праз увесь час, калі німа земскаго сабраньня, выбіраецца земская управа. Яна пільнуе каб пастанаўленьня земскаго сабраньня выпаўніліся, кіруе усім глядзіць за парадкам, прыймае на службу земскіх працоўнікоў і т. п.

Закон 1890 г. прыціснуў земствы ды шмат звузіў круг іх працы, — але усё ткі земская праца велася рупна і шчыра. Шмат зрабілі земствы для падняцьця культурнай вышыні народу. Для гэтаго годзі зраўнаваць толькі губэрні дзе ёсць земство з тымі, дзе яго німа — зраўненьне выпадзе далёка не на карысць апошніх.

Хоць большасьць земскіх гласных выбрана панамі — што у некаторых мейсцох выразна праявілася і на рэзультатах земскай працы—ўсё ткі шмат дзе перэмагалі людзі, каторые шырэй глядзелі на справы. Шмат дабра зрабілі яны і для селян. Асабліва вялікіе заслугі палажылі тут не самі гласные, а нанятые земствам на службу вучоные працоўнікі — статысты, дактары, аграномы, вучыцялі. Добрым словам павінен спамянуць іх працоўны народ,

## ДАРАГІЕ ЛЕКІ.

Прычапілася да Язэпа хвароба не раўнуючы, як пьяны прычапіўся да плоту і чым не ратаваўся, бедак, жаднай папраўы не было

— І каб ужо хвароба як хвароба была. а то брыда брыдой, — жаліўся Язэп, — дзень цягне, дзень смокчэ, два рвець, тры палошчэ!..

Усяк пробаваў ратавацца Язэп — нічога не памагало.

— Трэба, — казалі суседзі, — к доктару звярнуцца, той зразу угадае; не распазнае зверху, — машынку навядзе і будзе ведаць у чым рэч.

— А можэ і праўда —памысьліў Язэп.— Трэба людзей слухаць. І, доўга не аткладаючы, пачаў збіраць грошы на лекі.

Колькі дзён ўзапар ён не хадзіў з візытай да сядзельца і, як мог, ціснуў капейку.

Ўрэшці выбраўся у горад; незадоўга знайшоў доктара і к поўдню ужо сядзеў у прыёмнай

Там былі маладые і старые з задумлёнымі тварамі.

Глянуўшы на ўсіх Язэпу здавалося, што с такой хваробай як ён, то тут не было і ня будзе, бо ўсе, як адзін, здаровы на пагляд, як рыжыкі

Незадоўга распачаўся прыём.

Язэпа прынялі апошнім. Доктар доўга пытаўся ці пье гарэлку, як сьпіць, ці добра есць?

Язэп атказываў, але а асцярожкай, каб ня выказаць, што гарэлку пье, як у лейку ліе. Але доктар спазнаў і забараніў хадзіць да сядзельца Адлічыў Язэп поўрубля за візыту і выправіўся у аптэку.

Там агледзілі рэцэптку, аблічылі на два рублі лекарства і казалі прыйсці за гадзіну

Аж шорахна зрабілося Язэпу, як пачуў ён гэткую цану але ў канцы згадзіўся, што сам вінен калі даў разгнездзіцца хваробе.

За лекарствам прышлося ісці заўтра, бо шмат нехапало грошы.

Адыходзючы ад дзьвярэй аптэкі ён ешчэ раз глянуў праз вакно на бліскучую лысіну аптэкара і рызыкоўна заявіў сам сабе, што не шкадуе грошы, абы толькі помач была.

На заўтрае Язэп па лекарства сам не паехаў, а выправіў жонку.

— Кошак-жэ не забудзься узяць! — Дзесяты раз прыказываў Язэп. — На два рублі нададуць бутэляк: у прыпол не забярэш ды патаўчэш у дарозі.

— Добра, добра, — адказывае жонка. — узяла, — мала аднаго — другі у панарадзі ёсць.

Прыехаўшы у горад яна паважна увайшла у аптэку, цягнучы за сабой два вялізных кошы

Сваім вачам не паверыла кабеціна, калі убачыла, што ня тое каб у кошы не ўмясцілося, а у руцэ, як цукерак захавалося.

Не даваў веры і Язеп, як убачыў, што жонка прывезла

— Пэўне ашукаў мяне, цемражніка, той шалахвост! — Бедаваў Язэп пазіраючы на бутэлечку. Прышлося распачаць лекарство.

Прашло троха часу, вось суседзі і пытаюцца.—Ці памаглі лекі?

— Ды дзе там! — са злосцю атказываў ён. — Два рублі с палавінай упёр, чорт ведае за што. а помачы жаднай німа, — лепей бы за гэты грошы напіўся, то-б тры дні галава балела, а то нічога.

## АДУКАВАНАЯ КАБЫЛА.

Раз Гаўрылу здарылося на кірмашы сходна купіць вельмі прыгожую і непамерна вялікую сівую кабылу.

Радаваўся Гаўрыла, гледзючы на каняку, хвалілі і суседзі, кажучы, што яна палковая кабыла.

Дзень, другі патрымаў Гаўрыла яе на добрых харчох, а посьле як ні хацеў, а прышлося ўпрэгчы ў саху.

Нескладна хадзіла с сахою яна, відаць было. што незнаёма з ральлёй.

Замаркоцілася кабыла, як папрацавала ўзапар колькі дзён ат сонца да сонца.

Вертаючыся с поля ў вечэр на атпачынак, яна нудна глядзела ў той бок, аткуль яе прыгнаў новы гаспадар і прыпамінала, як добра жылося раней і як дрэнна цяпер. Бывала—аўса ў волю, дагляд, працы ніякай, гарцуй сабе пад музыку, ды толькі, а тут мерай с канца ў канец даўгі шнур на полі.

— І за што гэткі зьдзек учынілі?—горка жалілася яна сама сабе.

Вось неяк у сьвята Гаўрыла выбраўся зьезьдзіць у горад палюдзкавацца трохі, ды кабылку перэгнаць. Толькі ўехаў у шырокую вуліцу, ўбачыў, як на спатканьне ідзе пад

маючы на увазі у якіх цяжкіх варунках гэтым прыяцелям народу—прыходзілася—жыць і працаваць.

Посьле 1905 г. памешчыкі напужаные аграрнымі селянскімі рухамі, сталі выбіраць у гласные—прыхільнікоў прыгонных парадкоў. Гэтые людзі карыстаючыся с таго, што панскіх гласных шмат болей як іншых і у земствах вышла іхняя перэвага—перэвярнулі да гары нагамі земскую гаспадарку. Куды болей рупючыся аб тым, каб пасярод земскіх працоўнікоў не нашлося часам людзей з інакшымі думкамі, аб добрай пастаноўцы земскай справы, яны пачалі усіх каго лічылі «неблагонадёжнымі» гнаць вон з земскай службы. Тысячы дужа карысных працоўнікоў страціло мейсцы; бяз іх усё пашло бяз толку. Гадамі сумленнай, шчырай працы збудаваные культурные установы разваліліся, або дужа аслаблі.

Але у апошніе гады—земская гаспадарка патрошку зноў налажываецца. Вялікае значэньне мае і тое, што шмат дзе селяне пачалі выбіраць у гласные ад валасьцей святлейшых, разумных людзей, заступаюшчыхся за народ. Голас селянскіх гласных у некатарых расейскіх земствах звертае на сябе агульную увагу. Гэтак разумна і с толкам радзюць селянскіе прэдстаўнікі — што ёсць чаго паслухаць. Лепшая Частка гласных ад другіх станоў ідзе з імі разам. Шкада толькі, што селянскіх гласных наагул надта мала, другое што далёка ня ўсе гласные ад селян выступаюць у абарону выбраўшаго іх народу. Дужа часта выбіраюць селяне у гласные людзей цёмных, а то і мала сумленных. Сідзяць гэтые гласные на земскіх сабраньнях, «брады свае уставя»—а талковай рады, разумнаго слова ад іх не пачуеш.

Земствы у 3-х беларускіх губэрнях нарыхтаваны меней болей гэтак як у ўсей Расеі. Толькі дзеля націоналістычнай палітыкі зменшэны правы «інародцаў»—ды гласные ад селян, дайжэ у усіх земствах, вачмі толькі лыпаюць і зусім у абарону паслаўшай іх роднай вёскі не выступаюць.

**Лявон Гмырак.**

## У родным кутку.

Да 1 мая г. году трэба было пасьпяшыць у Ашмяну атбываць ратніцкі збор. Адбыць гэту павіннасць сабралося болей як 300 чэлавек—усё хлопцы каторые у восень 1913 году па льгопе, высокаму нумэру жрэбія і т д. былі залічэны «ратнікамі гасударственнаго апалчэньня 1 разрада». (Ратнік павінен за 1 месяц навучыцца ваеннаго строю, стрэляць і інш. Ратнік, так сама, як і салдат, прымаець прысягу).

Прыглядзецца с першаго разу да шэрай массы вясковай моладзі ня можна, але, пажыўшы разам колькі тыднёў, шмат можна чаго цікаваго прымеціць з духоўнаго жыцьцё гэтай массы. Праўда жыцьця так і бьець у вочы і гаворэ табе: прыймай усё, як ёсць... У нашай році, складаючэйся са 100 чэлавек, 40% каталікоў, 45% праваслаўных; 5% жыдоў. Ніякай асобнай розніцы паміж гэтымі людзьмі, падзеленымі на рэлігіі, не відаць: усіх еднае адна і тая мова, апратка склад душы, звязаннасць са сваім краем. Беларуская мова моцна трымаецна у ашмянскім павеці і на пытаньня, на якой мові размаўляюць — даюць найчасьцей адказ: «ведама гаворым па просту». І у гэтай «простай» мове — вялікая сіла, гавару гэтак не для слаўца добраго, але відзеў з якім старэньнем «дзядзькі» салдаты абучалі ратнікоў «славеснасці». Гэта цяжкая праца. За 5—8 дзён ня трудна было навучыць арудаваць стрэльбай, але во ужо скора ідзе 4-й тыдзень і бедные «дзядзькі» саўсім с сіл выбіліся, вучучы «славеснасці»:

...вы такіе, гэткіе... ані татары, ані армяне, здаецца расейцы і не чэрта ня ўмееця...»

І калі пад вечэр я з балючай галавой вырваўся з аўдыторыі славеснасці і перадамной спакойна несла свае воды Ашмянка, з яе правым, абрывістым берэгам і шырокімі, заліўнымі сенажацямі на левым берэзі, я мімавольна пытаў сябе: якую грамаду некарысных сіл нясе у сабе Ашмянка, якое багацьце у гэтым торфе, што ляжыць каля берэгу.

Хто знайдзе, адчыніць тые крыніцы Маці Нашай Старонкі. той магутнай творчасці народнай душы, што сцюдзёнымі крыніцамі усё-ж прабіваецца с пад цяжкай зямелькі і рвецца да сонца.

**Міхалка С.**

## Кароткі фэльетончык.

**„Панскі пакойчык“.**

У Хаіма Аблезлага назвычай смачные галкі з рыбы, што гатуе яго жонка Цырка; ёсць шчупачкі, ёсць марыната; падаецца шкалік гарэлкі з вялікай чаркай — «стаканчыкам» і піва бяз счоту. А заўсёдашнім сябрам Хаіма па другому нават разу мыюцца шклянкі, заўсёды такіе брудные, што і не пазнаць з якога шкла яны роблены.

Шынок Хаіма стаіць на вуглу. і хоць з віду ён і не надта мае цікавы выгляд, алеж ён тым вартоўны што з якога бы суседняга двара ні зайшоў — адразу патрапіш да Хаіма!

Гэтай «выгодай» надта карыстаюць людзі, каму бывае патрэба зайсці да Хаіма, а злашча такіе людзі, каторым і заходзіць, неяк, якбы троха не выпадае —для прыперу старшыне, судзям ці старастам.

З гэтай рацііі Хаім ніколі не зачыняе брамы, а праз суседні дзядзінец пралажыў ешчэ «запасны выход».

Хаіма празвалі Аблезлым, а ўсё праз тую прычыну, што ад таго часу як Ёсель залажыў першую мануфактурную краму ў мястэчку Смаргонях дзе Хаім трымае свой шынок—ён як пашыў сабе гарнітур нямецкаго крою, дык і да гэтых часоў яго не здымае с плеч; гарнітур аблез, зашмальцаваўся, роўна у скуру абярнуўся, алеж Хаім яго носе і прыслужывае у ім сваім «гасьцям...»

Праз нескольк‌і гадоў таргоўлі заўважыў Хаім, што яго карчма малая, і як конкурэнт Хаіма Муня палажыў новые абоі у сваей распівачнай, а другі—Габэль вымаляваў сваю карчму у зялёную фарбу—Хаім прыставіў трысценак да свайго шынку і назваў яго «панскім пакойчыкам».

. . . . . . . . . . . . . . . .

Але Хаім—гэшэфтовы жыдок; ён аткрыў «панскі пакойчык» для «гасьцей» раней ешчэ, як палажыў у ім дзерэвяную падлогу, а сьвежая земля пакідае моцные сьляды тых, хто сюды заходзе...

І вось што убачылі цікавые людзі ў сьлядох «панскаго пакойчыку».

Сядзелі тры судзі: Грышка Доўгі, яшчэ сусім малады чэлавек, Сымон Лысы, сярэдніх гадоў і судзейскі «падмаршалак»—жывы, вёрткі, такжэ не стары ешчэ чэлавек, хаця ж галава і барада досыць ужо спасівелі. Ен, як відаць, быў пры лясцы і у крамных ботах з высокімі гапсацамі на цвякох—бо на тым мейсцу, дзе ён сядзеў—застаўся яго вялікі сьлед...

Тутачка каля іх, «на прыпеку», сядзеў іх «сябр» і кожную мінуту варочаўся то да аднаго, то да другога наліваў у шклянкі і прыгаварываў:

— Дай жа Божэ, на здароўе!—Пійця, закусывайця, паны, не скупіцеся. Выпьем гэта, Хаім прынясе ешчэ.

Сперша «паны» бытцым нехаця браліся за чарку, моршчыліся: ведама,—трэба паказаць «цэрамонію». Ня то што — выпіў, з'еў — бытцым за свае грошы!..

А пагадзя, як увайшлі у стос, адзін с траіх (каторы, сляды не кажуць) посьле селедца і рыбы пажадаў гуся... другі—яечню, трэці—яек у крутую.

«Сябар» усім стараўся выстарчыць, і на ўсякае слова падбегаў да дзьвярэй і крычаў голасна:

Хаім, нясі поўбутэлькі дзьве пары піва і закуску! Хутчэй толькі!

Хаім прыносіў, а яму давалі прыказ нясьці другое...

. . . . . . . . . . . . . . . .

Як на стале спаражнела, у брусе патужэла і «судзьдзі праведные» мацней засаплі, «сябар» ўпоўголаса завёў мову наконта нейкай сваей справы.

— Слухай, ня будзь дурнем, заспакоіў яго «падмаршалак»—ня будзь, кажу, дурнем... Усё будзе, як найлепі. Тваё дзела чыстае, як...

— Як вот гэта шклянка; падхапіў яму Лысы.

— Вот відзіш...

— Ці сам за блазноў нас лічыш скрыўдзіўся Доўгі. Чы мы не знаем, што кажэм? Дзякуй Богу, не пьяные...

— Паночак, я ешчэ скажу Ха-

трэск барабану цьма салдатоў і з музыкай у перадзі.

Гаўрыла зьехаў на бок з дарогі і супыніў кабылу.

Тут музыка грымнула марш.

Не пасьпеў Гаўрыла перавесьці дух. як яго кабыла с сілай рванулася ў перад. выкуліла панарад у канаву і з выдзертымі аглаблямі панеслася у здагонку за музыкай, пад кідаючы зад у гару.

Гаўрыла, рэзнуўшыся галавой аб ліхтарны слуп. не бачыў, што было далей — толькі, калі апамятаваўся, ўбачыў, як кабылу яго вёў за аброць дзесяцкі.

— Ты што гэта на танцы яе прывёў, людзей пужаць?—грозна спытаўся ён.

— Шатан яе ведаў, што яна танцуе—атказаў Гаўрыла.

Кабылу атправілі на пажарны двор, а Гаўрылу паклікалі ў часць.

Толькі на заўтра ўбачыўся Гаўрыла с кабылкай. Яна заржала і весела зірнула на яго.

Па ўпаўшых бакох было відаць, што яна ноч прастаяла галоднай.

Глянуў Гаўрыла на яе і ўхмыльнуўся. Злосць адразу адпала ад яго.

— Ну як жэ танцы?—жартаваў ён. Ня вельмі? Я так і знаў, што не патрапіш у тахту, я вось чэлавек і розум не кабылячы, і то не патыкаюся, а то яна—вымкнулася... людзей напужала, ліхтары паварочала...

— Паедзем дамоў, у гасьцях гэта ня дома, табе пэўне тут і каліва сена ў губу не далі, а мяне, прызнаюся табе, добра пачаставалі...

**Галубок.**

## ЗЛІЧЫЛА.

Па дарозі з мястэчка З... у вёску Навасёлкі пхнецца канішка. цягнучы за сабой сані, у каторых сядзіць баба і ляжыць чэлавек. З заду, к санём, прымацавана сілядзёўка, а з яе тарчыць новая дуга і аўчына. Баба кіруе лейцамі і падсьцёбывае каня пугай пад бруха, і лае свайго Язэпа. Той прыпаднімаецца устаць ды ніяк ня можэ. Але баба памагла і неяк сеў разам з ей.

— Ну чаго ты лаешся, рыбка мая?—спытаў ён у яе. — Ты разбяры дзела, а посьле і лайся сабе...

— Што-ж тут разбіраць! — крычыць баба. — Прапіў рубель... Кожын кірмаш ты не даруеш! І-і-і, гад ты, бязбожны!..

— А ты злічы, а тады будзеш гаварыць. Ты слухай: аўчына—рубель, дуга—саракоўка з грыўняй. сілядзёўка—тры залатоўкі с грыўняй, а ты ўзяла пяць капеек...

— Дык-жэ усіх грошы тры рублі было!..

— Дурная ты, ты-ж лічы: аўчына — рубель...

Здачы у цябе многа эсталося? Лайдак ты! Ўсяго толькі грыўня. А гдзе ешчэ рубель?

— Ну што-ж? Ты лічы: найперш—аўчына рубель...

— Відзіш, як злажыўся гаварыць: аўчына, аўчына... Прычапіўся, як сьляпы да плоту... Тут дзіцянё змяркуе, што рубля не хапае... І як гэта цябе не разарвало?..

— Ты пяць капеек узяла! забылася?

— З дзесяткай усяго два рублі затрачэна.

— Маніш, старая! Давай я табе добра злічу.

— Давай!—Азардоўна крычыць баба.

— Аўчынка—рубель, лічыць Язэп, а дуга саракоўка з грыўняй — выходзіць рубель і два злоты; сілядзёўка—тры злотых з грыўняй, выходзіць рубель і пяць злотых з грыўняй; а табе пяць капеек дык ужо маеш — рубель і чатыры саракоўкі з грыўняй, а здачы—грыўня, значыцца, як раз два рублі...

— Ну, а ешчэ рубель дзе? — пытае баба.

— Рубель... дзе?.. аўчына мусі быць два рублі... Ды што з вамі бабамі, гаварыць! Вот я цябе спушчу с саней тагды злічыш на полі, сваім часам.

— Ах ты гад! Ты ешчэ у мяне запытай ці злезу я!..

— Злезеш!

— Ня злезу!

Язэп спіхае жонку у сьнег і, сцебануўшы каня пугай, ад'ехаў.

— Ах ты буян, разбойнік! Людцы ратуйця! — Крычыць баба не сваім голасам.

— Ну што? злічыла цяпер?—Крычыць ей здалёку Язэп, стрымаўшы каня.

— Злічыла, злічыла, зязюлёк мой!

**Язэп Шпэт.**

іму, каб падаў. Спахапіўся тут сябар, прыняўшы апошняе слова на свой шчот.

— Я ешчэ пастаўлю!?.

— Не. Дзякуй табе, досыць! Болей не ахвота... А вот ты кажэш, што..

— Добра, добра! А-ей! Чы, паны... Мне—абы дзела, а я не такі чэлавек... Я чужога не хачу. Будзе і яму...

«Сябар» дастаў паперку і палажыў на стале між бутэляк.

— Бяры,—кажэ «падмаршалак» Доўгаму — хавай!..

— Не... ты бяры. Я што?.. Бяры сам!

— Эй, які чэлавек, ня ўсё роўна!..

— Хібаж...

— А пакуль вы будзеця спрэчацца, я і забяру. Прасіця-ж вы у мяне посьле...

Сымон Лысы звярнуў і палажыў паперку да сваей кішэні. Усе разам падняліся з мейсц, азірнуліся на стол і папхнуліся да выхаду, пакінуўшы Хаіму парожніе бутэлькі і некольні рублёў грошы. Былі здаволены і Хаім, і «госьці» і «сябар».

Нават сама Хаіміха, як стаяла ў дзверах у заёхліным капоце, — бардзей адскочылася за касяк, прытулілася да сцяны і с паклонам правадзіла «гасьцей» на падворье.

**Язэп Гаротны.**

## Сэрцэ прарочэ.

Месяц бледны глядзіць на нямую
лагчыну,
Над затокаю вольха ківае галінай,
Пушча сьпіць ў зачарованам
сьне..
Ой, чаму гэтак сьлёзы мне вочы
туманюць?
Ой, чаму гэтак боль грудзі кволые
раніць?
Ой, чаму гэтак жудасна мне?

Сэрцэ нешта благое прарочэ,
І з грудзей яно вырвацца хочэ...

*

Можэ нейдзе, далёка, ў нязведан-
ным краю
Дарагая дзяўчынка мая памірае?.
Можэ сам буду скора канаць?..
Ой, рыхтуець мне нешта таёмная
доля...
Ой, маўчыць, якбы ведае, чыстае
поле...
Ой, лес цёмны ня хочэ казаць...

Сэрцэ нешта благое прарочэ,
І з грудзей яно вырвацца хочэ...

*

Ў самым сэрцы маім чараўніца
трывога,
Ў самым сэрцы маім царство Чор-
наго Бога
Разсевае атручэны мак...
І здаеццб ўсё сьпіць пад ціжарам
магілы,
І здаецца жыцьцё нецікава, ня-
міла,
Смокчэ кроў мне з грудзей
ваўкалак

Сэрцэ нешта благое прарочэ,
І з грудзей яно вырвацца хочэ...

**Ясакар.**

## Хмара.

Цягніцца па небі
Хмара дажджэвая,
Цёмнай паласою
Ўсю шыр закрывае.
Ляціць без дарогі,
Куды вецяр гоніць,
На людзей і птушак
Жуду, страх наводзіць.
Вось закрыла сонцэ,
Моцна зашумела,
Каршуном магучым
Над зямлёй ляцела.
Зрабілася цёмна,
Як у варывенцы,
У якой ёсць толькі
Малае вакенца.
Па дарозі пылкай
Каплі забранчэлі,
Як магá ўсе птушкі
ў гнёзды паляцелі.
Пастушок на полі
Пад ёлку схаваўся,
А дождж ык на волі
Добра разгуляўся.

**Ландыш.**

* * *

Люблю цябе, мой край радзімы,
Мой бедны Беларускі край,
Люблю твае балоты з мохам,
Люблю бярозавы твой гай!

Люблю туман у позну восень,
Люблю пахучы, сьветлы май;
Люблю цябе, мой край радзімы,
Як ні адзін на сьвеці край.

Люблю тваю страху с саломы
І песьню жаўранка вясной...
Люблю, як воўк галодны вые
У ночы лютаю зімой.

Люблю цябе ва ўсяку пору,
Твой лес і рэкі і зямлю,
Тваё жыцьцё, няволю-долю
І песьню сумную тваю!

**С. Шалкоўскі.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны

### Парафіянова.

У Парафіянове ёсць хаўрусная крама, стаіць яна на добрым і бойкім мейсцы, але селяне усё неяк яе абходзюць ды ідуць купляць у другіе крамы, калі ім што трэба купіць. Падумаеш, — незразумела, але як пабываеш сам, то зразу дагадаешся

Таргуець у гэтай крамі нейкая дужа дэлікатная паненка і мае сабе у помач вясковую дзяўчыну. Гаворыць паненка толькі па польску—яно сабе, што ты да яе звяртаешся па беларуску — паненка лічыць, што па беларуску гаворыць толькі горшы гатунак людзей і упорна табе атказывае па польску. Колькі разоў я заходзіў у гэту краму купіць што колечы, то ўсё чуў атказ «nema». Адзін раз удалося: пытаю паперы у вялікіх аркушах для прашэньнёў. — Ёсьціка па капейцы аркуш. — Добра, дайця тры аркушы (бо нашто-ж мне, думаю, браць многа па капейцы, калі я заўсёды плачу у жыдоўскай крамцы па грошу). Аддзяліла тры аркушы і падала мне. Я на гэты час ішоў з работы і рукі меў нячыстые, бо вешаў сала у вандлярні, то пакуль звінуў сам гэту паперу то яна зрабілася ня годнай да пісаньня. Чаму-ж гэта, думаю сабе вышоўшы, як я браў у жыдоў, то мне завівалі паперу куском газэты і атказывалі мне на маю беларускую мову, не іначэй як па беларуску.

А-а-а! дагадаўся: бо то жыды і яны пільнуюць толькі гандлю, а паненка апрача гандлю відаць пастаўлена такжэ і навучаць нас «дэлікатнасці панскай». Трудна, за навуку трэба плаціць, але ахвотнікоў плаціць за гэткую навуку чым далей меней будзе.

*А.....ч.*

### Кірмашоўцы.

У вёсцы Альхоўцы, Вілейск. пав., было такое здарэньне. 22 красавіка, Сымон Міцька паехаў з жонкай у Докшыцы на кірмаш. Сымон купіў новы плуг, а Сымоніха справіла свае справункі і пашлі па свайму абычаю у карчму на падвячорак. Там да іх прылучыліся ешчэ суседзі і яны добра падхмяліліся. Але ускарабкаўшысн сяк так на воз паехалі Сымон табакі не курыць, затое жонка яго купіўшы папірос «Богатыр», жарыла дарогай і неяк закінулз у сядзэння агню. Салома у карах з нізу угарэлася і чуць ужо вось не адгарэла. Сымоніха пачула, што з нізу нешта пячэ і саскочыла з возу, а Сымон неяк учапіў ногі у плуг і ніяк ня мог выкарабкацца: сядзіць ды толькі паварачываецца ад агні. Сымоніха прабавала сцягнуць, але нядолела, і німа ведама што-б было каб з заду ня ехалі людзі. Тые адраталі Сымона і патушылі агонь. У Сымоніхі то толькі адзеньня прагарэло ды дзе недзе крыху цела асмылела, а Сымон, бедак, дык і цяпер ляжыць жыватом на пасьцелі, панакладаўшы канпрэсоў і новы глуг ляжыць пад вуглом.

*А. Н.....ч.*

**Вёска Лоск,** Забрэзкай воласці, Ашмянскаго павету.

У нашай вёсцы жыве удава псаломшчыка Ольга Левай. Яна бедная і, сабраўшы некольні рублёў, купіла у казённым лесі дроў і мае на сваё імя ад смаргонскаго ляснічаго білет. Лес яна вырубала і збіралася ужо звязьці да хаты, ажно 6 мая прыехалі з Гародна, 5 вёрст ад Лоску, поп Кунаховіч з вучыцелям С. Косяком на 5 падводах і забралі удовіны дровы, ешчэ і налаялі яе.

Ўся наша вёска ўстрэпянулася, глядзя на гэткі грабеж. Што рабіць нашаму брату, дзе праўды шукаць?

Просім, міласцівы рэдактару, надрукаваць у вашэй газэці, можэ суд людзкі што паможэ... Ніхай хоць наша родная газэта пастаіць за праўду пакрыўджэнай ўдовы і пакажэ сьвету тую крыўду. Ніхай знае сьвет, што робіцца у глухой вёсцы.

*Селянін А. Сымановіч.*

## З Вітэбшчыны.

**Вёска Баяры,** Вітэбск. губ., Лепэльск. пав.

Вялікае нешчасце спаткало нашых селян: у нядзелю 11 мая у поўдзень, пры сільным ветры, выгарэла у $2^1/_2$ гадзіны вёска Баяры. Згарэла 58 хат, пагарэлі усе халодные будынкі, збожжэ, згарэло трое дзяцей, выратаваць нічога не удалося; асталося 58 сямей бяз хлеба і адзежы; некуды заганяць скацінку, нечым засеяць поле. Хто меў якіе грошы дык і тые пагарэлі.

Трэба спадзевацца, што знайдуцца добрые людзі, каторые не дадуць памерці з голаду нашым Баярцам. Пажар пачаўся ад таго, што дзеці дурэючы расклалі агонь у пуні.

*Сінгца.*

**Чародны нумэр выйдзе 5 чэрвеня.**

# З усіх старон.

### Забастоўкі і дэмонстрацii у Пецярбурзе.

У дзень суда (19 мая) над работнікамі казённаго Абухоўскаго заводу, пацягнутымі пад суд за мінуўшые забастоўкі, ад самай раніцы пачаліся забастоўкі работнікоў. Кінулі работу, работнікі 155 фабрычных установ, лікам 80 595 душ. Апрача фабрык і заводоў баставалі друкарні і дробные майстэрні. Былі дэмонстрацыі, пеялі песьні і выкідалі чырвоные сцягі.

### Правые і Гас. Дума.

Колькі дзён таму, адбылося у Пецярбурзі заседаньня глаўнай рады «саюза рускаго народу», на каторым абгаварывалі сучаснае палітычнае палажэньне у звязку з апошнімі здарэньнямі у Гас. Думе. Сабраньне ураіло падтрымліваць міністра ўнутрэнных спраў Маклакова, палажэньне катораго у апошніе часы крыху закалыхалося. Пасьля пачаліся гутаркі аб Думе. Усе прамоўцы у адзін голас заявілі, што «уступкі» рабіць левай часьці Думы ня можна. Іншые пашлі далей і выказаліся у тым значэньні, што правіцельство павінно перэстаць «цацкацца» з Думай і падумаць аб росцуску яе і аб перамене самога закону аб Думе, у кірунку аграніченьня яе правоў. Адзін с членоў сабраньня сказаў, што аб роспуску Думы не так даўно раіліся выдатные дзеяцелі дваранства і прызналі, што трэба распусціць Думу і змяніць закон аб ей. Адным словам правые рупна працуюць над тым, каб зніштожыць народнае прэдстаўніцтво.

### Неправўдападобная гісторыя.

Газэты паведамляюць, што гэтымі днямі у Петрапаўласкай крэпасці сталася такая прыгода На панадворку крэпасці гулялі салдацкіе дзеці. Нехта з іх кінуў камень і прыпадкам трапіў у міма прахадзячаго чэлавека. Начальнік крэпасьці загадаў выявіць прозвішча таго хлопчыка, што кінуў камень Але ніхто з дзяцей не прызнаўся. Тады начальнік загадаў высеч розгамі усіх салдацкіх дзяцей у крэпасьці і прыпаручыў зрабіць гэта салдату, у катораго ёсць многа дзяцей. Той са сьлезамі у вачах прасіў генерала увольніць яго ад гэтаго. Тады генерал пакараў яго і даручыў біць дзяцей другому салдату, каторы не мае дзяцей. Дзяцей бытцым сабралі у адно мейсцо, іх агледаў крэпасны лекар і прызнаў, што усе яны вытрымаюць кару. Пасьля гэтаго пачалі секчы дзяцей пад асабістым даглядам лекара.

### Справа самаупраўленьня гарадоў у Польшчы.

У Гас. Радзе, прагледаючы закон аб самаупраўленьні гарадоў у Польшчы, чыслом галасоў члены Рады аткінулі польскую мову у самоупраўленьні Палякі, дэпутаты Гас. Думы, саўсім збэнтэжэны гэткім вынікам справы. Яны ня могуць памірыцца з мысляй, што Гас. Рада, зложэная у большай сваей часці с правых назначэных членоў, падавала галасы проці правіцельства, меўшаго у стасунку да гэтаго пытаньня загад з вышэйшых кругоў. Польскіе паступовые газэты нападаюць на «польскае коло» у Гас. Думе, кажучы, што яно сваей паніклівай палітыкай, прымыкаючы у Гас. Думе да расейскіх чорнасоценных арганізацій, паставіло польскае грамадзянство у дужа непрыемнае палажэньне. Коло адбіло ад палякоў даўнейшых прыхільнікоў, паступовае расейскае грамадзянство, і не знайшло новых.

### Сьмерць быўшаго міністра ўнутрэнных спраў.

У Пецярбурзі памёр 16 мая, ад разрыву сэрца князь Сьвятополк-Мірскі, быўшы міністр ўнутрэнных спраў пасьля убіўства Плевэ. Сьвятополк-Мірскі, калі яго назначылі міністрам ўнутрэнных спраў казаў:—Кіраваць Расеей пры помачы арэштоў і турэм не магу. Усіх пасадзіць у Петрапаўлоўскую крэпасць ня можна. Зялезная рука Плевэ давела гасударства да руіны».

